лиотечных, библиографических и информационных процессов. На наш взгляд, целесообразно остановиться на разработанной МП "Информсистема" системе "МАРК" в качестве основы.

Необходима четкая связь сотрудников кафедры информатики и библиотеки института и координация планов по созданию АС вуза культуры.

## СТРУКТУРА І ЗМЕСТ ПАДРУЧНІКА ПА ГАЛІНОВАЙ БІБЛІЯГРАФІІ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА КОМПЛЕКСУ

В.А.Касап
Р.А.Ровіна
Т.А.Каралева
М.В.Іваноў

Пытанні ўдасканалення падрыхтоўкі бібліятэчных работнікаў у новых сацыяльна-эканамічных умовах патрабуюць неадкладнага палепшання вучэбна-метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу і, перш за ўсё, – стварэння новых падручнікаў, пабудаваных на матэрыяле бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Ад наяўнасці нацыянальных падручнікаў па спецыяльным дысцыплінам залежыць якасць прафесіянальнай падрыхтоўкі выпускнікоў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Стварэнне падручнікаў па галіновым бібліяграфічным дысцыплінам з'яўляецца аб'ектам пільнай увагі бібліятэчнай грамадскасці на працягу доўгага часу, сведчаннем чаго былі дыскусіі на старонках спецыяльнага друку ў 70-х і 80-х гадах.

У свой час на секцыі бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі Вучэбна-метадычнага савета было прызнана мэтазгодным стварэнне інтэграваных падручнікаў, у т.л. па бібліяграфіі прыродазнаўства, тэхнікі і сельскай гаспадаркі.

Падрыхтоўка падручніка па курсу "Бібліяграфія прыродазнаўчай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры" – неадкладная праблема, таму што апошняе выданне такога падручніка было ў 1971 годзе. Найбольш вострымі пры падрыхтоўцы падручніка з'яўляюцца пытанні структуры і зместу, аптымальных суадносін агульнадачаленевчага і нацыянальнага, агульнага і спецыяльнага (галіновага).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэркі і карціны завешваюцца тканінай. Дзе-ніздзе знешняй прыкмай жалобы было і застаецца чорнае адзенне на сваяках, або чорная хустка на галаве жанчын. Сустракаюцца выпадкі выконвання рэлігійных прадпісанняў, адпяванне памершага, удзел свяшчэнніка. Усе часцей, пасля смерці блізкага чалавека сем'і звяртаюцца да паслуг пахавальных бюро, асабліва ў горадзе, якія бяруць на сябе клопаты, звязаныя з пахаваннем. Вядомым грамадскім дзеячам пахаванне арганізоўвае прадпрыемства, дзяржаўная установа, труну з целам нябожчыка для развітання устанаўліваюць у будынку, арганізацыі, клуба, праводзіцца жалобная паніхіда.

Па існуючай у Беларусі традыцыі хаваюць нябожчыка на другі, радзей на трэці дзень, пахаванне праходзіць у другой палове дня. Па звычаю выносяць нябожчыка наперад нагамі, блізкія сваякі не павінны несці труну, капаць магілу. Бытуе і такі звычай, як кіданне жменькі зямлі ў яму на труну, традыцыйныя магільныя збудаванні, узгоркі і іншае. Ускараняюцца пахаванні ў суправаджэнні аркестра або жалобнай музыкі, запісанай на магнітафон, але востра стаіць праблема музыкальнага суправаджэння ў сельскай мясцовасці. З пабудовай у Мінску ў 1986 г. крэматорыя, пахаванне праходзіць у сцяне кулумбарыя, куды устанаўліваецца урна з прахам.

Найбольш поўна з пахавальнай абраднасці захаваліся памінальныя абрады. Шырока бытуе сярод насельніцтва звычай наладжваць пасля пахавання памінальную трапезу "жалобны стол", іншыя тэрміны правядзення памінак, асабліва сорак дзён і гадавіна. Захаваўся звычай наведваць магілы нябожчыкаў у дзень памяці памерлых вясной - "радаўніцу", які зараз стаў непрацоўным днем. З 1988 г. у рэспубліцы адраджаецца і восенькі дзень памінання продкаў - "змітраўскія дзеды". Захаваліся на памінальных трапезах і абрадавыя стравы. Самыя распаўсюджаныя - гэта канун, сыта, часам каша, боршч, у асобных месцах прысутнічае некалькі абрадавых страў, якія абавязаны пакаштаваць усе прысутныя.

Адзначаюцца ў пахавальнай абраднасці негатыўныя моманты: гэта высокі кошт пахавання, жудаснае становішча могілак і шмат іншага.